ЗАЦВЕРДЖАНА
Рашэнне Бешанковіцкага раённага
выканаўчага камітэта
”06“ мая 2020 г № 390

# СТАТУТ

# ДЗЯРЖАЎНАЙ УСТАНОВЫ КУЛЬТУРЫ ”БЕШАНКОВІЦКАЯ ЦЭНТРАЛІЗАВАНАЯ БІБЛІЯТЭЧНАЯ СІСТЭМА“

# УСТАВ

# ГОСУДАРСТВЕННОГО УЧРЕЖДЕНИЯ КУЛЬТУРЫ ”БЕШЕНКОВИЧСКАЯ ЦЕНТРАЛИЗОВАННАЯ БИБЛИОТЕЧНАЯ СИСТЕМА“

г.п.Бешанковічы
2020 год

# СТАТУТ
## дзяржаўнай установы культуры
## ”Бешанковіцкая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма“

## Глава 1
## АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1. Дзяржаўная ўстанова культуры ”Бешанковіцкая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма“ (далей – Установа) з’яўляецца дзяржаўнай установай культуры, носьбітам агульначалавечых каштоўнасцей, скарбніцай культурных здабыткаў, галоўным кнігасховішчам Бешанковіцкага раёна.

2. Установа створана на нявызначаны тэрмін, дзейнічае ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь і сапраўдным Статутам.

3. Заснавальнікам Установы з’яўляецца Бешанковіцкі раённы выканаўчы камітэт.

4. Установа падпарадкоўваецца аддзелу ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Бешанковіцкага раённага выканаўчага камітэта.

5. Установа аб’ядноўвае сетку публічных бібліятэк Бешанковіцкага раёна, якія функцыянуюць на правах яго структурных падраздзяленняў (філіялаў) (Дадатак 1), якія дзейнічаюць на падставе Палажэнняў, зацверджаных ва ўстаноўленым парадку.

6. Поўнае найменне Ўстановы:

- на беларускай мове – дзяржаўная ўстанова культуры ”Бешанковіцкая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма“;
- на рускай мове – государственное учреждение культуры ”Бешенковичская централизованная библиотечная система “;

скарочанае найменне Ўстановы:

- на беларускай мове – ДУК ”Бешанковіцкая ЦБС“;
- на рускай мове – ГУК ”Бешенковичская ЦБС“.

7. Установа з’яўляецца юрыдычнай асобай, якая мае ў аператыўным кіраванні адасобленую маёмасць, нясе самастойную адказнасць па сваіх абавязках, можа ад свайго імя набываць маёмасныя і асабістыя немаёмасныя правы і несці абавязкі, быць ісцом і адказчыкам у судзе, мець рахункі ў банках, у тым ліку валютныя, мае круглую пячатку з выявай Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь і сваім найменнем, штампы, бланкі, уласную сімволіку.

8. Установа з’яўляецца некамерцыйнай арганізацыяй, якая створана ўласнікам для дасягнення сацыяльна-культурных мэт, задавальнення духоўных і іншых нематэрыяльных патрэбнасцей грамадзян, выканання іншых функцый некамерцыйнага характару ў

сферы культуры ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь і сапраўдным Статутам.

9. Установа нясе адказнасць па сваіх абавязках грашовымі сродкамі, якія знаходзяцца ў яе распараджэнні. Пры іх недастатковасці субсідыярную адказнасць у выпадках, прадугледжаных заканадаўствам, па яе абавязках нясе ўласнік маёмасці Ўстановы.

10. Месцазнаходжанне Ўстановы: Віцебская вобласць, г.п.Бешанковічы, вул.Камуністычная, д.12.

11. Установа задавальняе ўніверсальныя інфармацыйныя патрэбнасці карыстальнікаў структурных падраздзяленняў раёна і з'яўляецца:

- раённым інфармацыйным і сацыякультурным цэнтрам;
- раённым цэнтрам па каардынацыі і кааперацыі дзейнасці структурных падраздзяленняў раёна па набыцці, стварэнні, фарміраванні і ўзаемавыкарыстанні інфармацыйных рэсурсаў;
- раённым галіновым цэнтрам інфармацыі па культуры;
- раённым цэнтрам міжбібліятэчнага абанемента, цэнтрам дакументаабмену і пераразмеркавання дакументаў;
- раённым навукова-метадычным цэнтрам па бібліятэчнай справе, бібліятэказнаўстве, бібліяграфазнаўстве, кнігазнаўстве, краязнаўстве;
- раённым дэпазітарыям краязнаўчых дакументаў;
- каардынацыйным і метадычным цэнтрам сукупнай сеткі бібліятэк Бешанковіцкага раёна, каардынацыйным і метадычным цэнтрам раённага ўзроўню сеткі публічных бібліятэк.

12. Установа мае права:

- самастойна вызначаць змест, формы і метады сваёй дзейнасці ў адпаведнасці з мэтамі, задачамі і функцыямі, замацаванымі ў сапраўдным Статуце;
- вызначаць крыніцы камплектавання бібліятэчных фондаў;
- ажыццяўляць дзейнасць, якая прыносіць даход, у тым ліку аказваць платныя паслугі;
- выключаць і рэалізоўваць дакументы з бібліятэчных фондаў;
- устанаўліваць правілы карыстання структурнымі падраздзяленнямі Ўстановы, парадак рэгістрацыі карыстальнікаў структурных падраздзяленняў Установы;
- прымаць меры па кампенсацыі ўрону, нанесенага карыстальнікамі структурным падраздзяленням Установы, у адпаведнасці з грамадзянскім заканадаўствам;
- вызначаць умовы выкарыстання бібліятэчных фондаў на падставе дагавораў з юрыдычнымі асобамі, грамадзянамі, у тым ліку індывідуальнымі прадпрымальнікамі;

- удзельнічаць у рэалізацыі дзяржаўных і іншых праграм, накіраваных на захаванне, развіццё, распаўсюджванне і (або) папулярызацыю культуры;
- супрацоўнічаць з замежнымі бібліятэкамі, замежнымі і міжнароднымі юрыдычнымі асобамі, у тым ліку весці міжнародны дакументаабмен, уваходзіць ва ўстаноўленым парадку ў міжнародныя арганізацыі, удзельнічаць у рэалізацыі міжнародных праграм;
- аб’ядноўвацца ў бібліятэчныя асацыяцыі (саюзы);
- набываць, ствараць, фарміраваць і выкарыстоўваць інфармацыйныя рэсурсы;
- ажыццяўляць збор дакументаў у электронным выглядзе, пры неабходнасці ствараць копіі дакументаў у электронным выглядзе з выкананнем патрабаванняў заканадаўства аб аўтарскім праве і сумежных правах;
- выкарыстоўваць у рэкламных ці іншых мэтах уласнае найменне, сімволіку, выявы свайго будынка, рэпрадукцыі культурных каштоўнасцей, якія захоўваюцца ў бібліятэчным фондзе;
- праводзіць культурна-асветную работу і культурна-адукацыйную дзейнасць, звязаную з музейнымі прадметамі, навукова-дапаможнымі матэрыяламі, а таксама гісторыка-культурнымі каштоўнасцямі;
- выяўляць прадметы музейнага значэння, камплектаваць музейныя фонды, ажыццяўляць улік, захоўванне, вывучэнне і папулярызацыю музейных прадметаў, выкарыстоўваць іх для эстэтычнага выхавання і культурнага развіцця грамадзян;
- страхаваць сваю маёмасць;
- засноўваць сродкі масавай інфармацыі;
- удзельнічаць ва ўнутрырэспубліканскім дакументаабмене і пераразмеркаванні дакументаў, міжнародным дакументаабмене.

Установа мае іншыя правы, прадугледжаныя актамі заканадаўства Рэспублікі Беларусь.

13. Установа абавязана:

- садзейнічаць забеспячэнню правоў карыстальнікаў структурных падраздзяленняў Установы, прадугледжаных заканадаўствам Рэспублікі Беларусь;
- абслугоўваць карыстальнікаў структурных падраздзяленняў Установы ў адпаведнасці з сапраўдным Статутам і правіламі карыстання структурнымі падраздзяленнямі Установы;
- не выкарыстоўваць звесткі аб карыстальніках структурных падраздзяленняў Установы і іх запытах у іншых мэтах, акрамя навуковых і бібліятэчных;

- садзейнічаць доступу карыстальнікаў структурных падраздзяленняў Установы да рэгіянальных, нацыянальных і сусветных баз даных;
- забяспечваць захаванасць бібліятэчных фондаў;
- пры наяўнасці ў бібліятэчных фондах кніжных помнікаў забяспечыць іх захаванасць і ўключэнне ў Дзяржаўны рэестр кніжных помнікаў Рэспублікі Беларусь, іншыя зводныя каталогі, базы даных;
- пры прадастаўленні карыстальнікам структурных падраздзяленняў Установы актуальнай прававой інфармацыі Рэспублікі Беларусь забяспечваць магчымасць доступу да эталоннай прававой інфармацыі.

Установа мае іншыя абавязкі, прадугледжаныя актамі заканадаўства Рэспублікі Беларусь.

14. Бібліятэчны фонд Установы з'яўляецца агульнадаступным. Абмежаванні па яго выкарыстанні вызначаюцца толькі ў мэтах аховы кніжных помнікаў, а таксама ў выпадках, прадугледжаных заканадаўствам.

15. Змяненні і дапаўненні ў сапраўдны Статут уносяцца ў выпадках і тэрміны, якія ўстаноўлены заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

16. Рэарганізацыя або ліквідацыя Ўстановы ажыццяўляецца ва ўстаноўленым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь парадку.

## Глава 2
## МЭТА, ЗАДАЧЫ, ФУНКЦЫІ І ВІДЫ ДЗЕЙНАСЦІ ЎСТАНОВЫ

17. Асноўнай мэтай дзейнасці Ўстановы з'яўляецца задавальненне ўніверсальных інфармацыйных патрабаванняў карыстальнікаў бібліятэк.

18. Асноўнымі задачамі Ўстановы з'яўляюцца:
- камплектаванне бібліятэчных фондаў дакументамі і забеспячэнне іх захаванасці;
- ажыццяўленне апрацоўкі дакументаў, стварэнне даведачна-бібліяграфічнага апарату;
- забеспячэнне бібліятэчнага, інфармацыйнага і даведачна-бібліяграфічнага абслугоўвання карыстальнікаў структурных падраздзяленняў Установы згодна з іх патрэбнасцямі і інтарэсамі;
- выяўленне прадметаў музейнага значэння, камплектаванне музейных фондаў, улік, захоўванне, вывучэнне і папулярызацыя музейных прадметаў, выкарыстанне іх для эстэтычнага выхавання і культурнага развіцця грамадзян;
- правядзенне культурна-асветнай работы, накіраванай на садзейнічанне культурнаму развіццю карыстальнікаў структурных падраздзяленняў Установы;

- навукова-даследчая дзейнасць у сферы бібліятэказнаўства, бібліяграфазнаўства, кнігазнаўства, краязнаўства;
- каардынацыя дзейнасці бібліятэк Бешанковіцкага раёна па фарміраванні адзінай інфармацыйнай прасторы.

19. У адпаведнасці з асноўнымі задачамі Ўстанова выконвае наступныя асноўныя функцыі:

- фарміруе, зберагае, пастаянна захоўвае і прадастаўляе карыстальнікам структурных падраздзяленняў Установы найбольш поўны збор краязнаўчых дакументаў, навукова значных айчынных і замежных дакументаў;
- арганізуе доступ да рэгіянальных, нацыянальных і сусветных баз даных;
- забяспечвае каардынацыю ўзаемадзеяння бібліятэк Бешанковіцкага раёна з органамі навуковай інфармацыі, архівамі, музеямі і іншымі юрыдычнымі асобамі па ўзаемавыкарыстанні інфармацыйных рэсурсаў;
- набывае бібліятэчныя зборы ў вядомых пісьменнікаў, дзеячаў навукі, культуры і мастацтва, іх спадчыннікаў, іншых грамадзян, а таксама ў букіністычных кнігарнях і на аўкцыёнах;
- ажыццяўляе навукова-даследчую дзейнасць па бібліятэказнаўстве, бібліяграфазнаўстве, кнігазнаўстве, краязнаўстве;
- прадастаўляе дакументы, бібліяграфічную і іншую інфармацыю ў адпаведнасці з правам грамадзян на бібліятэчнае, інфармацыйнае і даведачна-бібліяграфічнае абслугоўванне;
- праводзіць культурна-асветную работу, накіраваную на садзейнічанне культурнаму развіццю карыстальнікаў структурных падраздзяленняў Установы;
- ажыццяўляе выдавецкую дзейнасць, накіраваную на падрыхтоўку і выпуск інфармацыйных і метадычных выданняў, навуковых публікацый па бібліятэказнаўстве, бібліяграфазнаўстве, кнігазнаўстве, краязнаўстве;
- забяспечвае каардынацыю і кааперацыю дзейнасці бібліятэк Бешанковіцкага раёна па набыцці, стварэнні, фарміраванні і ўзаемавыкарыстанні інфармацыйных рэсурсаў, аказанні электронных паслуг.
- Установа выконвае іншыя функцыі, прадугледжаныя заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

20. Установа ажыццяўляе розныя віды дзейнасці ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

21. У выпадку, калі асобныя віды дзейнасці падлягаюць ліцэнзаванню ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь,

Установа мае права ажыццяўляць такую дзейнасць пасля атрымання адпаведных ліцэнзій.

## Глава 3
## МАЁМАСЦЬ УСТАНОВЫ

22. Маёмасць Установы складаюць асноўныя сродкі, у тым ліку будынак і збудаванні, абсталяванне і іншыя матэрыяльныя каштоўнасці, кошт якіх утрымліваецца на самастойным балансе Ўстановы.

Маёмасць Установы з’яўляецца дзяржаўнай уласнасцю.

23. Установа фінансуецца за кошт сродкаў мясцовага бюджэту. Дадатковае фінансаванне Ўстановы можа ажыццяўляцца за кошт грашовых сродкаў фізічных і юрыдычных асоб, у тым ліку замежных, а таксама грашовых сродкаў, атрыманых ад бязвыплатнай (спонсарскай) дапамогі, аказання платных паслуг і іншай дзейнасці, якая прыносіць даход і неабходна для выканання мэт, прадугледжаных сапраўдным Статутам, адпавядае гэтым мэтам і прадмету дзейнасці некамерцыйных арганізацый, і з іншых крыніц, не забароненых заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

24. Установа можа ажыццяўляць дзейнасць, якая прыносіць даход. Атрыманыя ад такой дзейнасці даходы і набытая за іх кошт маёмасць паступаюць у самастойнае распараджэнне Ўстановы і выкарыстоўваюцца ва ўстаноўленым парадку.

25. Установа не мае права без згоды ўласніка адчужаць або іншым спосабам распараджацца замацаванай за ім маёмасцю і маёмасцю, набытай за кошт выдзеленых яму сродкаў, калі іншае не вызначана Грамадзянскім кодэксам Рэспублікі Беларусь або іншымі заканадаўчымі актамі.

26. Установа не мае права выступаць гарантам, паручыцелем трэціх асоб – юрыдычных асоб недзяржаўнай формы ўласнасці (у тым ліку долі (акцыі) у статутных фондах, якіх знаходзяцца ў дзяржаўнай уласнасці) і фізічных асоб (у тым ліку індывідуальных прадпрымальнікаў) па выкананні гэтымі асобамі сваіх абавязацельстваў па звароце крэдытаў, дадзеных банкамі і нябанкаўскімі крэдытна-фінансавымі арганізацыямі, калі іншае не вызначана Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

## Глава 4
## КІРАЎНІЦТВА ЎСТАНОВАЙ

27. Кіраўніцтва дзейнасцю Ўстановы ажыццяўляе дырэктар. Дырэктар назначаецца на пасаду і вызваляецца ад яе начальнікам аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Бешанковіцкага

раённага выканаўчага камітэта па ўзгадненні з Заснавальнікам. З дырэктарам Установы заключаецца кантракт.

28. Дырэктар Установы ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь і сапраўдным Статутам:

- арганізуе работу Ўстановы і нясе адказнасць за выкананне пастаўленых перад ёй задач і планавых заданняў;
- забяспечвае стварэнне ўмоў для зберажэння маёмасці, эфектыўнага выкарыстання рэсурсаў Установы для вырашэння вытворчых задач і сацыяльнага развіцця калектыву;
- прымае на работу і звальняе з работы работнікаў структурных падраздзяленняў Установы;
- вызначае колькасць, зацвярджае структуру і штатны расклад работнікаў структурных падраздзяленняў Установы ў межах фонду аплаты працы;
- зацвярджае склад савета Ўстановы, камісій, вызначае парадак і напрамкі іх дзейнасці;
- выдае загады і распараджэнні, абавязковыя для ўсіх работнікаў і структурных падраздзяленняў Установы;
- распараджаецца фінансавымі і матэрыяльнымі сродкамі Ўстановы;
- забяспечвае падачу справаздач органам дзяржаўнай статыстыкі;
- дзейнічае ад імя Ўстановы, прадстаўляе яе ў арганізацыях Рэспублікі Беларусь і за яе межамі;
- заключае дагаворы ад імя Ўстановы;
- адкрывае ў банках разліковы і іншыя рахункі; прымяняе да работнікаў структурных падраздзяленняў Установы меры заахвочвання і накладае дысцыплінарныя спагнанні;
- прымае меры, накіраваныя на развіццё і ўдасканальванне матэрыяльна-тэхнічнай базы Ўстановы, выкананне правілаў тэхнікі бяспекі і супрацьпажарных мерапрыемстваў;
- нясе адказнасць за вынікі работы Ўстановы, выкананне патрабаванняў сапраўднага Статута, абавязацельстваў перад аддзелам ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Бешанковіцкага раённага выканаўчага камітэта, працоўным калектывам і Заснавальнікам;
- хадайнічае аб прыёме Ўстановы і ўдзеле яе ў рабоце міжнародных бібліятэчных арганізацый;
- размяркоўвае абавязкі паміж супрацоўнікамі;
- назначае на пасаду і вызваляе ад пасады работнікаў Установы, заключае з імі працоўныя дагаворы (кантракты);
- выконвае іншыя абавязкі, прадугледжаныя дзеючым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

29. Калегіяльнымі органамі кіравання Ўстановы з’яўляюцца саветы і камісіі.

## Глава 5
## РАБОТНІКІ ЎСТАНОВЫ

30. Працоўныя адносіны з работнікамі Ўстановы, уключаючы пытанні найму і звальнення, рэжыму працы і адпачынку, умоў працы, гарантый і кампенсацый, рэгулююцца ў працоўных дагаворах (кантрактах) у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

31. Работнікі Ўстановы вырашаюць:

- пытанні заключэння з наймальнікам калектыўнага дагавора, разглядаюць яго праект і ўпаўнаважваюць свайго прадстаўніка падпісаць яго ад імя работнікаў Установы;
- іншыя пытанні самакіравання работнікаў Установы ў межах сваёй кампетэнцыі, устаноўленай заканадаўствам Рэспублікі Беларусь і сапраўдным Статутам.

## Глава 6
## УЛІК, СПРАВАЗДАЧНАСЦЬ І КАНТРОЛЬ ЗА ДЗЕЙНАСЦЮ ЎСТАНОВЫ

32. Установа ажыццяўляе аператыўны і бухгалтарскі ўлік вынікаў дзейнасці, прадстаўляе ва ўстаноўленым парадку статыстычную справаздачу, а таксама аператыўную інфармацыю аб выніках фінансава-гаспадарчай дзейнасці.

33. За непрадстаўленне і скажэнне дзяржаўнай справаздачы, парушэнне тэрмінаў яе прадастаўлення, службовыя асобы Ўстановы нясуць устаноўленую заканадаўствам адказнасць.

34. Комплексная рэвізія фінансава-гаспадарчай дзейнасці Ўстановы праводзіцца згодна заканадаўству Рэспублікі Беларусь.

35. Падатковыя і іншыя дзяржаўныя органы, на якія заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь ускладзена праверка асобных бакоў дзейнасці Ўстановы, ажыццяўляюць такія праверкі, па меры ўзнікнення неабходнасці і строга ў межах сваёй кампетэнцыі.

## Глава 7
## РЭАРГАНІЗАЦЫЯ І ЛІКВІДАЦЫЯ ЎСТАНОВЫ

36. Рэарганізацыя Ўстановы (зліццё, далучэнне, раздзяленне, выдзяленне, пераўтварэнне) можа быць ажыццёўлена па рашэнні Заснавальніка, гаспадарчага суда.

37. Установа лічыцца рэарганізаванай, за выключэннем выпадкаў рэарганізацыі ў форме далучэння, з даты дзяржрэгістрацыі зноў узнікшых юрыдычных асоб.

Пры рэарганізацыі Ўстановы ў форме далучэння да іншых юрыдычных асоб Установа лічыцца рэарганізаванай з даты ўнясення ў адзіны дзяржаўны Рэестр юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў запісу аб спыненні дзейнасці далучанай юрыдычнай асобы.

38. Правапераемнасць пры рэарганізацыі Ўстановы надыходзіць ў парадку, устаноўленым заканадаўствам і ажыццяўляецца ў адпаведнасці з перадаткавым актам або раздзяляльным балансам.

39. Перадатачны акт і раздзяляльны баланс павінны ўтрымліваць палажэнні аб правапераемстве па ўсіх абавязацельствах Установы ў дачыненні да ўсіх яго крэдытораў і даўжнікоў, уключаючы абавязацельствы, аспрэчваецца бакамі.

Перадатачны акт і раздзяляльны баланс сцвярджаюцца заснавальнікам Установы і прадастаўляюцца разам з устаноўчымі дакументамі для рэгістрацыі зноў ўзнікшых юрыдычных асоб.

40. Ліквідацыя Ўстановы цягне спыненне яго дзейнасці без пераходу правоў і абавязкаў у парадку правапераемства іншым асобам за выключэннем выпадкаў, прадугледжаных заканадаўствам.

41. Калі кошт маёмасці Ўстановы не дастатковы для задавальнення патрабаванняў крэдытораў, Установа ў судовым парадку можа быць прызнана эканамічна неплацежаздольнай (банкрутам).

Прызнанне Ўстановы эканамічна неплацежаздольнай цягне яе санацыю, а пры немагчымасці або адсутнасці падстаў працягу дзейнасці – ліквідацыю.

42. Заснавальнік Установы, пасля прыняцця рашэння аб ліквідацыі Ўстановы, прызначае ліквідацыйную камісію і ўстанаўлівае, у адпаведнасці з заканадаўствам, парадак і тэрміны яе ліквідацыі.

43. Установа лічыцца ліквідаванай з даты ўнясення запісу ў адзіны дзяржаўны Рэестр юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў.

Дадатак 1

ПЕРАЛІК
структурных падраздзяленняў (філіялаў)
дзяржаўнай установы культуры
”Бешанковіцкая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма“

1. Цэнтральная раённая бібліятэка
2. Дзіцячая раённая бібліятэка
3. Ульская сельская бібліятэка
4. Драздоўская сельская бібліятэка
5. Палітаддзельская сельская бібліятэка
6. Вярхоўская сельская бібліятэка
7. Ржаўская сельская бібліятэка
8. Бешанковіцкая гарпасялковая бібліятэка
9. Астровенская сельская бібліятэка
10. Задарожская сельская бібліятэка
11. Сініцкая сельская бібліятэка-клуб
12. Сокараўская сельская бібліятэка-клуб
13. Бачэйкаўская сельская бібліятэка імя Барыса Паўлавіча Беляжэнкі

Зацверджана:
Рашэнне Бешанковіцкага
раённага
выканаўчага камітэта
31 ліпеня 2023 г. № 8

Змены і дапаўненні
ў статут дзяржаўнай установы культуры
”Бешанковіцкая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма“

1. Пункт 4 главы 1 змяніць і выкласці ў наступнай рэдакцыі:
”4. Установа падпарадкоўваецца сектару культуры Бешанковіцкага раённага выканаўчага камітэта. “.
2. Пункт 27 главы 4 змяніць і выкласці ў наступнай рэдакцыі:
”27. Кіраўніцтва дзейнасцю Ўстановы ажыццяўляе дырэктар. Дырэктар назначаецца на пасаду і вызваляецца ад яе загадчыкам сектара культуры Бешанковіцкага раённага выканаўчага камітэта па ўзгадненні з Заснавальнікам. З дырэктарам Установы заключаецца кантракт.“.
3. Пункт 28 падпункт 13 главы 4 змяніць і выкласці ў наступнай рэдакцыі:
”- нясе адказнасць за вынікі работы Ўстановы, выкананне патрабаванняў сапраўднага Статута, абавязацельстваў перад сектарам культуры Бешанковіцкага раённага выканаўчага камітэта, працоўным калектывам і Заснавальнікам; “.
4. Дадатак 1 змяніць і выкласці ў наступнай рэдакцыі:

Дадатак 1

ПЕРАЛІК
структурных падраздзяленняў (філіялаў)
дзяржаўнай установы культуры
”Бешанковіцкая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма“

1. Цэнтральная раённая бібліятэка
2. Ульская сельская бібліятэка
3. Драздоўская сельская бібліятэка
4. Палітаддзельская сельская бібліятэка
5. Вярхоўская сельская бібліятэка
6. Ржаўская сельская бібліятэка
7. Астровенская сельская бібліятэка
8. Задарожская сельская бібліятэка

9. Сініцкая сельская бібліятэка
10. Сокараўская сельская бібліятэка
11. Бачэйкаўская сельская бібліятэка імя Барыса Паўлавіча Беляжэнкі

Витебский областной исполнительный комитет
Бешенковичский районный
исполнительный комитет
ГОСУДАРСТВЕННАЯ РЕГИСТРАЦИЯ
Регистрационный номер 391013989
26.11.2025 Ж.С.Кицарь
дата подпись (фамилия, инициалы)

Зацверджана:
Рашэнне Бешанковіцкага
раённага выканаўчага
камітэта
17.07.2025 №871

Змены і дапаўненні
ўстатут дзяржаўнай установы культуры
”Бешанковіцкая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма“

Дадатак 1 змяніць і выкласці ў наступнай рэдакцыі:

Дадатак 1

ПЕРАЛІК
структурных падраздзяленняў (філіялаў)
дзяржаўнай установы культуры
”Бешанковіцкая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма“

1. Цэнтральная раённая бібліятэка
2. Ульская сельская бібліятэка
3. Драздоўская сельская бібліятэка
4. Палітаддзельская сельская бібліятэка
5. Вярхоўская сельская бібліятэка
6. Ржаўская сельская бібліятэка
7. Астровенская сельская бібліятэка
8. Задарожская сельская бібліятэка
9. Сініцкая сельская бібліятэка
10. Бачэйкаўская сельская бібліятэка імя Барыса Паўлавіча Беляжэнкі